Галоўнае ўпраўленне адукацыі Гомельскага аблвыканкама

Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Гомельскі абласны інстытут развіцця адукацыі”

# Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі ў выкладанні вучэбных прадметаў “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура” як сродак павышэння якасці адукацыі




Матэрыялы абласнога семінара

Гомель, 2021

**Удзельнікі семінара:** метадысты устаноў (арганізацый), якія ажыццяўляюць навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыі, кіраўнікі МА, настаўнікі беларускай мовы і літаратуры

**Дата правядзення:** 26 кастрычніка 2021 года

**Форма правядзення:** вебінар

**Мэта:** удасканаленне прафесійнай кампетэнтнасці педагагічных работнікаў па прымяненні сучасных адукацыйных тэхналогій як важнага фактару павышэння якасці адукацыі

**Задачы:**

актуалізаваць веды педагагічных работнікаў аб сутнасці і спосабах выкарыстання сучасных адукацыйных тэхналогій у выкладанні вучэбных прадметаў "Беларуская мова", "Беларуская літаратура";

пашырыць уяўленні педагогаў аб шляхах удасканалення прафесійнай кампетэнтнасці для павышэння якасці адукацыйнага працэсу па беларускай мове і літаратуры праз выкарыстанне сучасных адукацыйных тэхналогій;

прадэманстраваць прадуктыўны педагагічны вопыт выкарыстання ў адукацыйным працэсе эфектыўных метадаў і прыёмаў, якія садзейнічаюць павышэнню выніковасці адукацыйнага працэсу.

## Парадак правядзення семінара

| | |
|---|---|
| **10.00 - 10.05** | **Адкрыццё семінара** |
| | *Блажко Вольга Аляксандраўна, прарэктар па вучэбнай рабоце дзяржаўнай установы адукацыі "Гомельскі абласны інстытут развіцця адукацыі" (далей – ГАІРА)* |
| **10.05 - 10.30** | **Кіраванне прафесійным ростам педагога як умова павышэння выніковасці адукацыйнага працэсу** |
| | *Сторaж Святлана Іванаўна, начальнік вучэбна-метадычнага аддзела гуманітарных дысцыплін ГАІРА* |
| **10.30 - 10.40** | **Прыярытэтныя напрамкі дзейнасці па папулярызацыі беларускай мовы і пашырэнні сферы яе выкарыстання ва ўстановах адукацыі Жлобінскага раёна** |
| | *Федарава Алена Леанідаўна, загадчык ДУА "Жлобінскі раённы вучэбна-метадычны кабінет"* |
| **10.40 - 10.55** | **Эфектыўныя прыёмы візуалізацыі вучэбнай інфармацыі пры вывучэнні вучэбных прадметаў "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура"** |
| | *Смарцэлава Наталія Дзмітрыеўна, настаўнік беларускай мовы і літаратуры ДУА "Гімназія №1 г.Жлобіна"* |

| | |
|---|---|
| **10.55 - 11.05** | **Фарміраванне лінгвакультуралагічнай кампетэнцыі вучняў або Як захоўваць каштоўнасці нацыянальнай культуры** |
| | *Аўласцова Наталля Міхайлаўна, настаўнік беларускай мовы і літаратуры ДУА “Гімназія №1 г.Жлобіна”* |
| **11.05 - 11.15** | **Метад “пяць пальцаў” як сродак візуалізацыі вучэбнай інфармацыі на ўроках беларускай мовы для фарміравання якасных ведаў вучняў** |
| | *СяліцкаяТаццяна Георгіеўна, настаўнік беларускай мовы і літаратуры ДУА “Сярэдняя школа №7 г.Жлобіна”* |
| **11.15 - 11.25** | **Забеспячэнне якаснага ўспрымання і засваення вучэбнага матэрыялу на ўроках беларускай мовы і літаратуры праз выкарыстанне сродкаў візуалізацыі** |
| | *Яўсеенка Ірына Віктараўна, настаўнік беларускай мовы і літаратуры ДУА “Рэчыцкі раённы ліцэй”* |
| **11.25 – 11.35** | **Персанальны сайт настаўніка беларускай мовы і літаратуры як сродак павышэння моўнай адукацыі** |
| | *Мігаль Алена Генадзьеўна, настаўнік беларускай мовы і літаратуры ДУА “Хальчанская базавая школа” Веткаўскага раёна* |
| **11.35 - 11.45** | **Карткі-канструктар урока для ўдасканалення метадычнай кампетэнтнасці настаўнікаў** |
| | *Казачэнка Ірына Рыгораўна, настаўнік беларускай мовы і літаратуры ДУА “Лельчыцкая раённая гімназія”* |
| **11.45 - 12.00** | **Падвядзенне вынікаў семінара. Абмен думкамі** |
| | *Блажко Вольга Александраўна, прарэктар па вучэбнай рабоце ГАІРА* |

Начальнік вучэбна-метадычнага аддзела
гуманітарных дысцыплін
ДУА “Гомельскі абласны інстытут
развіцця адукацыі” С.І.Сторадж

УЗГОДНЕНА
Намеснік начальніка
галоўнага ўпраўлення адукацыі
Гомельскага аблвыканкама
Ж.А.Ждановіч

# Кіраванне прафесійным ростам педагога як умова павышэння выніковасці адукацыйнага працэсу

*Сторaж Святлана Іванаўна,*
*начальнік вучэбна-метадычнага аддзела гуманітарных дысцыплін дзяржаўнай установы адукацыі «Гомельскі абласны інстытут развіцця адукацыі»*

Якаснае кіраванне прафесійным ростам педагога спрыяе павышэнню эфектыўнасці адукацыйнага працэсу. Прааналізуем колькасны і якасны саставы настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры вобласці.




Адукацыйны працэс па вучэбных прадметах “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура” згодна дадзеным уліку педагагічных кадраў вобласці па стане на кастрычнік 2021 года забяспечваюць 1350 настаўнікаў. Спецыялізацыю па гэтых прадметах маюць не ўсе. Крыху больш 6% педагогаў з’яўляюцца настаўнікамі, ў асноўным, рускай мовы і літаратуры, пачатковых класаў, гісторыі. Яны павінны быць аб’ектамі увагі метадычных служб раёна.



Для 1191 настаўніка вучэбныя прадметы “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура”з’яўляюцца асноўнымі. Разгледзем іх кваліфікацыйны ўзровень.

Амаль 85% настаўнікаў маюць кваліфікацыйныя катэгорыі “настаўнік-метадыст”, вышэйшую і першую кваліфікацыйныя катэгорыі. Гэта лепшы паказчык за апошнія 5 гадоў. Станоўчая дынаміка павышэння кваліфікацыйнага ўзроўню педагогаў назіраецца ва ўсіх раёнах вобласці. Адбываецца павелічэнне колькасці настаўнікаў з кваліфікацыйнай катэгорыі “настаўнік-метадыст”.




Гэтай катэгорыі ўдастоены 408 педагогаў рэспублікі, 55 з іх – у Гомельскай вобласці. У параўнанні з іншымі рэгіёнамі рэспублікі мы маем лепшы вынік: з 36 настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры гэтай кваліфікацыйнай катэгорыі ўсёй рэспублікі – 8 з Гомельскай вобласці.




Гэта Жгарова Валянціна Мікалаеўна, Панякова Ірына Іванаўна, Беднякова Ірына Валянцінаўна, Казачэнка Ірына Рыгораўна, Паляшчук Аксана Мікалаеўна, Мігаль Алена Генадзьеўна, Яраш Таццяна Леанідаўна і Яўсеенка Ірына Віктараўна, якія прадстаўляюць 6 раёнаў вобласці і горад Гомель.




Іх вопыт трэба выкарыстоўваць для падрыхтоўкі педагогаў, якія могуць прэтэндаваць на прысваенне вышэйшай, першай і другой кваліфікацыйных катэгорый. У гэтым напрамку дзейнасці ў параўнанні з 2016 годам назіраецца станоўчая дынаміка, аднак па стане на пачатак 2021/2022 навучальнага года, як і раней, мы маем вялікую колькасць педагогаў, якія не выкарыстоўваюць права павышэння кваліфікацыйнага ўзроўню. У кастрычніку 2021 года гэта лічба склала 303, крыху болей за 25% ад агульнай колькасці настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры нашай вобласці.




На працягу кожнага навучальнага года ад устаноў адукацыі вобласці пасупаюць накірункі на здачу кваліфікацыйнага экзамена пры праходжанні атэстацыі на прысваенне вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі.

На базе інстытута і раёнаў, у Акадэміі паслядыпломнай адукацыі за апошнія 4 навучальныя гады 279 настаўнікаў паспяхова здалі экзамен на вышэйшую катэгорыю. Аднак назваць актыўным удзел раёнаў у гэтым працэсе мы не можам, бо амаль такая ж колькасць настаўнікаў складае рэзерв.




За мінулы навучальны год 60 педагогаў прымалі ўдзел у экзаменах, для 48 з якіх ён быў выніковым. Светлагорскі, Рэчыцкі, Чачэрскі, Жлобінскі, Гомельскі, Буда-Кашалёўскі, Калінкавіцкі, Лоеўскі, Хойніцкі раёны, Навабеліцкі, Чыгуначны г.Гомеля забяспечылі якасны ўдзел настаўнікаў рэзерва ў экзаменах. Веткаўскі, Рагачоўскі, Жыткавіцкі, Добрушскі, Нараўлянскі раёны, Савецкі і Цэнтральны раёны г.Гомеля праводзілі работу ў гэтым напрамку дзейнасці недастаткова: не ўсе іх педагогі справіліся з выпрабаваннем экзаменам. 3 раёны вобласці, Кармянскі, Лельчыцкі і Мазырскі не здолелі падрыхтаваць да экзамена нават па адным педагогу.

Лічым неабходным забяспечыць сістэмнасць у рабоце па падрыхтоўцы настаўнікаў да ўсіх этапаў атэстацыі. Мэтазгодна арганізаваць трансляцыю вопыта педагогаў, якія паспяхова прайшлі атэстацыю, прапанаваць ім падзяліцца ўражаннямі аб экзамене, расказаць аб ззаданнях, аўвагах камісіі і г.д. Карысным будзе правядзенне практычных заняткаў па складанні метадычных распрацовак урокаў, абагульненні асабістага педагагічнага вопыту.

Задача метадычных служб заключаецца яшчэ і ў тым, каб садзейнічаць засваенню педагогамі зместа нарматыўных прававых дакументаў і інструктыўна-метадычных матэрыялаў, актуалізацыі ведаў па вучэбных прадметах. Гэта таксама лепш рабіць у практычнай форме.

Для забяспечання практычнай падрыхтоўкі педагогаў раім выкарыстоўваць матэрыялы сайта інстытута. Праз радок меню трэба перайсці ў раздзел “Атэстацыя”, у якім выбраць падраздзел “Кваліфікацыйны экзамен”.

У 2021 годзе тут размешчана спецыфікацыя білета для кожнай катэгорыі настаўнікаў. У адпаведнасці з ёй распрацоўваюцца білеты да экзаменаў. Праходжанне пробнага тэціравання дазваляе не толькі атрымаць уяўленні аб змесце заданняў экзамена, але і выявіць прабелы ў сваіх ведах.

Комплекснае суправаджэнне падрыхтоўкі настаўнікаў у перыяд атэстацыі спрыяе не толькі станоўчаму яе праходжанню, а і навогул, павышэнню якасці адукацыйнага працэсу. Разгледзім асноўныя паказчыкі якасці адукацыі.

Пачнем з вынікаў цэнтралізаванага тэсціравання 2021 года.

Усяго па вобласці ЦТ па беларускай мове здавала 1486 выпускнікоў. Сярэднеабласны бал па беларускай мове склаў 62,05. Гэта на 17,98 бала вышэй за сярэдні абласны бал па ўсіх прадметах. Дыяпазон балаў склаў ад 3-х мінімальных да 100 максімальных. 34 выпускнікі набралі ад 3-х да 20 балаў. 426 юнакоў і дзяўчат, а гэта 28,66% ад здаваўшых ЦТ па беларускай мове, не асілелі 50-бальны бар’ер. А значыць, мы з вамі не забяспечылі амаль 30-ці працэнтам выпускнікоў якаснага засваення вучэбнай праграмы.

1060 выпускнікоў атрымалі ад 50 да 100 балаў.


Стобальнікі

| Установа адукацыі | 2015 | 2016 | 2017 | 2018 | 2019 | 2020 | 2021 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Брагінскі | | | | | | | 1 |
| Добрушскі | | | | | 1 | | |
| Ельскі | | | | | | 1 | |
| Жлобінскі | | | 1 | | | | |
| Калінкавіцкі | | | | 1 | | | |
| Кармянскі | | | | | | 1 | |
| Лельчыцкі | | | | | | 1 | |
| Лоеўскі | | | 1 | | | 2 | |
| Мазырскі | | | | | | 1 | 1 |
| Светлагорскі | | 2 | | | | 2 | |
| Хойніцкі | | | | | | 1 | |
| Чачэрскі | | | | | | | |
| г.Гомель | | | | | | 1 | |
| Савецкі | | 1 | | | | 1 | |
| Цэнтральны | | | | | | 1 | |
| Чыгуначны | | 1 | | | 1 | 1 | 1 |
| ГДАЛ | 1 | | 1 | | | 2 | |
| МДАЛ | | | | | 2 | 1 | |

У 2021 годзе ўладальнікамі 100-бальных сертыфікатаў па беларускай мове сталі 40 удзельнікаў ЦТ усёй рэспублікі, 3 з якіх – выпускнікі ўстаноў адукацыі нашай вобласці. Як вы бачыце, гэты прыблізны вынік ЦТ у мінулыя гады, калі не лічыць 2020, калі па ўсёй рэспубліцы было 78 уладальнікаў найвышэйшага балу, сярод якіх 16 – з Гомельшчыны.




Тры ўстановы адукацыі атрымалі самыя высокія балы па выніках ЦТ па беларускай мове ў 2021 годзе. У параўнанні з аналагічным паказчыкам 2019 года яны значна палепшылі свае вынікі. Адметным з’яўляецца той факт, што

гэтыя 3 установы рознага тыпу: гімназія і школы, якія размяшчаюцца ў гарадской і сельскай мясцовасці.




Высокія паказчыкі яшчэ ў 18 устаноў адукацыі, сярэдні бал ЦТ па беларускай мове якіх склаў ад 80 амаль да 90 балаў. У сукупнасці гэта 21 установа вобласці! Пры чым сярод іх: 2 ліцэя, яны выдзелены чырвоным колерам, 4 гімназіі, сіні колер (+ Нараўлянская гімназія з папярэдняга слайда), 6 школ з гарадской мясцовасці (чорны колер) і з папярэдняга слайда СШ №25 г.Гомеля і яшчэ 9 школ, размешчаных у сельскай мясцовасці, абазначаны зялёным колерам, да іх дадаем Равенскаслабадскую СШ Рэчыцкага раёна.

Добрасумленная плённая праца і правільнае, граматнае супрацоўніцтва з вучнямі і іх законнымі прадстаўнікамі даюць шанец не толькі выбраным, а усім, хто насамрэч сур’ёзна і мэтанакіравана рыхтуецца да ЦТ.




12 раёнаў вобласці і Навабеліцкі раён г.Гомеля, прадстаўленыя ў левым слупку, паказалі вынікі, вышэйшыя за сярэдні бал па вобласці.

9 раёнаў вобласці, Цэнтральны, Чыгуначны і Савецкі раёны г.Гомеля, прадстаўленыя ў правым слупку, не змаглі дасягнуць 62 балаў. Амаль усім з іх не хапіла ад 1 да 5 балаў. Здаецца, зусім незначная розніца. Аднак мы ведаем, што нават 1 бал можа вырашыць лёс хлопца або дзяўчыны. Кожная наша недапрацоўка ў падрыхтоўцы вучняў да ЦТ можа каштаваць ім пазбаўлення магчымасці здзейсніць свае мары, рэалізаваць планы на будучыню.




У 3-х ўстановах адукацыі сярэдні бал выпускнікоў склаў ад 13,5 да 22 балаў, У параўнанні з вынікамі ЦТ 2019 года гэтыя ўстановы паказалі вынікі значна ніжэй. Адна з праблем заключаецца ў тым, што беларускую мову ва ўстановах, пазначаных чырвоным колерам, выкладаюць настаўнікі, якія не маюць спецыялізацыі па гэтым прадмеце. А вынікі ЦТ сведчуць, што якаснага выкладання беларускай мовы тут няма. І нават, калі гэтыя настаўнікі не працуюць у выпускных класах, а ь толькі на 2-й ступені, то ўжо ў той час яны не заклалі дзецям патрэбную базу ведаў.



На слайдзе пералічаны ўстановы адукацыі, сярэдні бал якіх ніжэй за самы нізкі сярэдні бал сярод раёнаў – 48,16 бала. Гэта прадстаўнікі ўстаноў 13 раёнаў вобласці, Савецкага, Цэнтральнага і Чыгуначнага раёнаў Гомеля і Гомельскага кадэцкага вучылішча.




18 устаноў разам з тройкай анты-лідэраў складаюць ар’ергард рэйтынгу ЦТ вобласці па беларускай мове. І тут 21 установа і амаль усё тая ж разнастайнасць. Адсутнасць у гэтым анты-рэйтынгу ліцэяў з’яўляецца нормай. А вось знаходжанне тут гімназіі г.Веткі – гэта выключэнне, ці чакаемы вынік недобрасумленнай працы? Хочацца думаць, што першае.

Мы бачым, што ў параўнанні з вынікамі ЦТ 2019 года большасць устаноў значна знізіла свае вынікі (яны абазначаны чырвоным колерам), у той час як сярэдні бал па вобласці мала змяніўся.

У чым прычына такіх вынікаў? Магчыма, нізкая стрэсаўстойлівасць вучняў, няправільная профарыентацыйная работа, а можа і нізкі ўзровень прафесійных ведаў педагога. У любым выпадку, гэтыя дадзеныя – прадмет сур’ёзнага, дэтальнага аналізу прычын такіх нізкіх вынікаў і вызначэння шляхоў іх пераадольвання.

Лічым мэтазгодным:

садзейнічаць удасканаленню кантрольна-ацэначнай дзейнасці настаўнікаў і забяспечыць аб’ектыўнасць ацэньвання навучэнцаў. Гэта дазволіць пазбегнуць сітуацый, калі вучань мае больш высокі за яго рэальныя веды бал і вырашае рызыкнуць і пайсці на ЦТ;

неабходна забяспечыць сістэмнаць і бесперапыннасць у падрыхтоўцы навучэнцаў да ЦТ;

з улікам рэкамендацый па выніках ЦТ трэба праводзіць шэраг метадычных мерапрыемтсваў на базе устаноў раёна, а таксама арганізоўваць дзелавую гульню, аналагічную дыягнастычнаму тэсціраванню, якая ўжо двойчы праводзілася для настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры вобласці;

абавязковай умовай лічым забеспячэнне ўдзелу школьнікаў у рэпетыцыйным тэсціраванні і зрэз-тэстах.

Сістэмная арганізацыя такой работы дазволіць дасягнуць поспехаў не толькі на ЦТ, а і па другіх напрамках дзейнасці. А гэта сёння немагчыма без выкарыстання сучасных адукацыйных рэсурсаў, адным з якіх з’яўляецца адзіны інфармацыйны адукацыйны рэсурс.




На рэсурсе прадстаўлены матэрыялы, якія могуць выкарыстоўваць настаўнікі, вучні і іх бацькі, па розных вучэбных прадметах з 1 па 11 клас. Неабходна зайсці ў раздзел “Агульная сярэдняя адукацыя”, потым выбраць клас і вучэбны прадмет.




Матэрыялы рэсурса размеркаваны па тэмах у адпаведнасці з вучэбнай праграмай. Чырвоны колер тэмы абазначае, што матэрыялы па дадзенай тэме у наяўнасці.




Па кожнай тэме ў рубрыках “ведаць” і “умець” прадстаўлены задачы, якія вучань павінен вырашыць падчас яе вывучэння. Відэаролік дазваляе не толькі азнаёміцца з тэарэтычным матэрыялам па тэме, а і выканаць прапанаваныя заданні. Па выніках вывучэння тэмы вучні могуць выканаць тэставае заданне. Па пэўных тэмах прадстаўлены дадатковыя матэрыялы, якія дапамогуць больш якаснаму засваенню тэмы.




З галоўнай старонкі рэсурса праз раздзел “Дадатковыя матэрыялы” можна трапіць на сайты інстытутаў развіцця адукацыі, на Нацыянальны адукацыйны партал.




На партале праз радок меню, выбраўшы катэгорыю “Педагогам”, трапляем у актуальныя раздзелы, назвы якіх прадстаўлены на слайдзе.

Метадычным службам рэкамендуем пастаянна выкарыстоўваць матэрыялы партала пры правядзенні метадычных мерапрыемстваў. Упэўнены, што гэта акажа непасрэдны ўплыў на паляпшэнне якасці работы.




| | 2017 | 2018 | 2019 | 2020 | 2021 |
|---|---|---|---|---|---|
| Светлагорскі | | | | | 1 |
| Акцябрскі | | | 1 | | 2 |
| Добрушскі | | 1 | | | |
| Жлобінскі | 1 | 2 | | | |
| Жыткавіцкі | 1 | | | | |
| Мазырскі | | 1 | 1 | | 2 |
| г.Гомель | | | 1 | | |
| Рэчыцкі | | 1 | | | 1 |
| Савецкі | | 1 | 1 | 2 | |
| Светлагорскі | | | | | 1 |
| Цэнтральны | | | | | 3 |
| ГДАЛ | | | | | 1 |
| МДАЛ | | | | | 1 |

Немалаважным паказчыкам якасці ведаў вучняў з’яўляецца выніковы ўдзел у алімпіядным руху. Вынікі выступлення навучэнцаў Гомельскай вобласці на заключным этапе рэспубліканскай алімпіяды па беларускай мове і літаратуры за апошнія 5 гадоў прадстаўлены на слайдзе:

Выніковую работу ў гэтым накірунку паказваюць па сутнасці 7 раёнаў вобласці: Акцябрскі, Добрушскі, Жлобінскі, Жыткавіцкі, Мазырскі, Рэчыцкі, Светлагорскі раёны, установы адукацыі г.Гомеля і абласныя ліцэі.


Вынікі заключнага этапу
рэспубліканскай алімпіяды

| Установа адукацыі | 2019 | 2020 | 2021 |
|---|---|---|---|
| Гімназія №10 г.Гомеля | | | 1 |
| Гімназія №36 г.Гомеля імя І.Мележа | 1 | | |
| Гімназія №51 г.Гомеля | 1 | 2 | |
| Гімназія №56 г.Гомеля імя А.А.Вішнеўскага | | | 2 |
| Акцябрская раённая гімназія | 1 | | 2 |
| ГДАЛ | | | 1 |
| МДАЛ | | | 1 |

Пераможцаў заключнага этапу ў апошнія 3 гады падрыхтавалі Яўсеенка настаўнікі 5-ці гімназій: 10, 36, 51 і 56 г.Гомеля, Акцябрскай раённай гімназіі і абласных ліцэяў.

Вялікі дзякуй нашым настаўнікам за гэтыя перамогі!




Па выніках ІІІ этапа рэспубліканскай алімпіяды па беларускай мове і літаратуры стабільна дыпломы атрымоўваюць вучні Акцябрскага, Добрушскага, Жлобінскага, Калінкавіцкага, Лельчыцкага, Мазырскага, Петрыкаўскага, Рэчыцкага Светлагорскага раёнаў, Савецкага, Цэнтральнага і Чыгуначнага раёнаў Гомеля, устаноў падпарадкавання упраўлення адукацыі Гомельскага гарвыканкама, абласных ліцэяў. На слайдзе ўуказана колькасць дыпломаў гэтага года.

За кожным пераможцам стаіць настаўнік, раённы трэнер, якія вучаць, падтрымліваюць, дапамагаюць атрымаць перамогу, нават у рабоце над сабой.

Астатнія 8 раёнаў вобласці і Навабеліцкі раён Гомеля маюць нестабільныя вынікі.




На працягу апошніх 5-ці гадоў не маюць пераможцаў на ІІІ этапе рэспубліканскай алімпіяды Веткаўскі, Нараўлянскі, Хойніцкі, Чачэрскі раёны. На працягу двух гадоў – Жыткавіцкі раён.




Аналізуючы ўдзел у абласной алімпіядзе 4-9 класаў за 5 апошніх гадоў, хочацца адзначыць выніковую работу Акцябрскага, Добрушскага, Жлобінскага, Калінкавіцкага, Мазырскага, Рэчыцкага, Светлагорскага, Чачэрскага раёнаў, Навабеліцкага, Савецкага, Чыгуначнага, Цэнтральнага раёнаў г.Гомеля. Колькасць дыпломаў гэтага года вы бачыце на слайдзе.

Брагінскі, Гомельскі, Жыткавіцкі, Лоеўскі, Лельчыцкі, Нараўлянскі, Петрыкаўскі, Рагачоўскі раёны і установы падпарадкавання упраўленняю адукацыі Гомельскага гарвыканкама, а гэта ў дадзеным выпадку гімназія 36 імя Мележа г.Гомеля, маюць нестабільныя вынікі.




Буда-Кашалёўскі, Веткаўскі і Ельскі раёны не маюць пераможцаў 2 апошнія гады правядзення алімпіяды.

Трывогу выклікаюць 2 раёны вобласці, у якіх за апошнія 5 гадоў няма пераможцаў абласной алімпіяды. Гэта Кармянскі і Хойніцкі раёны.




Стабільнасць вынікаў адразу ў рэспубліканскай і абласной алімпіядзе дэманструюць Акцябрскі, Добрушскі, Жлобінскі, Калінкавіцкі, Мазырскі, Рэчыцкі, Светлагорскі раёны, Савецкі, Цэнтральны і Чыгуначны раёны г.Гомеля. Астатнія раёны вобласці, Навабеліцкі раён г.Гомеля і установы падпарадкавання упраўлення адукацыі Гомельскага гарвыканкама дэманструюць папераменныя поспехі.

Няма ні аднаго пераможцы за 5 апошніх гадоў на 3-м этапе рэспубліканскай алімпіяды і на абласной алімпіядзе ў Хойніцкім раёне.

Алімпіядны рух патрабуе сістэмнай работы з улікам пераемнасці, пачынаючы ўжо з пачатковых класаў. Важна берагчы і падтрымліваць цікавасць дзіцяці да вывучэння прадмета і да ўдзела ў алімпіядным руху. Для этага неабходна тлумачыць самім вучням, іх бацькам тыя станоўчыя моманты, якія атрымлівае пераможца 3-га і заключнага этапу рэспубліканскай алімпіяды. 10 балаў у атэстаце, 100-бальны сертыфікат і ільготы пры паступленіі ва ўстановы вышэйшай адукацыі варты таго, каб удзельнічаць у алімпіядзе.

Для падтрымкі цікавасці да вывучэння роднай мовы і літаратуры ва ўстанове адукацыі павінна быць створана такая сістэма работы, калі мерапрыемствы праводзяцца не толькі ў межах прадметнага тыдня, а на працягу ўсяго года з абавязковым удзелам алімпіяднікаў.

Трэба начынаць падрыхтоўку да водгука не з 9 класа, а значна раней, негледзячы на тое, што падчас абласной алімпіяды такі тур не праводзіцца. Менавіта па гэтым туры многія удзельнікі атрымліваюць балы значна ніжэйшыя за комплексную работу. Добрай падрыхтоўкай да рэспубліканскай алімпіяды з’яўляецца ўдзел у абласных конкурсах.




У перыяд трэніровачных збораў праводзіцца лінгвістычны конкурс па беларускай мове і літаратуры “Ведай родную мову.” Гэты конкурс ставіць на мэце падрыхтоўку вучняў да лінгвістычнага этапу алімпіяды (напісанне комплекснай работы і водгуку). Апошнія два гады ў конкурсе могуць прымаць удзел пераможцы 3-га этапу рэспубліканскай алімпіяды.

За перыяд існавання конкурсу становіцца зразумела, што ў шэрагу раёнаў пры падрыхтоўцы вучняў да алімпіяды настаўнікі недастаткова ўувагі надаюць навучанню алімпіяднікаў напісанню водгука, таму па конкурсным заданні “напісанне міні-сачынення” атрымліваюць вельмі нізкія балы, што не дазволіла ні ў адзін год атрымаць дыплом пераможцы. .

Кожны год станавіліся пераможцамі конкурсу прадстаўнікі Добрушскага, Жлобінскага, Мазырскага раёнаў, Савецкага раёна г.Гомеля.




Абласны конкурс рытарычнага майстэрства "Гавары са мной па-беларуску" праводзіцца з мэтай развіцця інтэлектуальнага патэнцыялу навучэнцаў, павышэння агульнага культурнага ўзроўню гаварэння, фарміравання ў навучэнцаў спецыяльных камунікатыўных уменняў і навыкаў, выяўлення здольных і лінгвістычна адораных дзяцей. У конкурсе прымаюць удзел навучэнцы IX-XI класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з ліку пераможцаў II этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах "Беларуская мова", "Беларуская літаратура".

8 раёнаў і ўстановы адукацыі г.Гомеля маюць пераможцаў штогадова. А гэта сведчыць аб сістэмным падыходзе ў падрыхтоўцы да алімпіяд.




На наступным слайдзе прадстаўлены вынікі рэспубліканскага конкурсу работ даследчага характару вучняў. На працягу 5-ці год мы маем пераможцаў

дзякуючы крапатлівай сістэмнай працы 5-і настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры гімназіі №51 г.Гомеля: Кірушкінай Марыі Іванаўны і Афанасьевай Наталлі Васільеўны, Крэч Таццяны Сяргееўны з Акцябрскай гімназіі, Дарошка Таццяны Іванаўны, настаўніка 6-й школы Светлагорска і Дземішкан Вольгі Ігараўны, настаўніка 10-й школы Светлагорска.




Адбор удзельнікаў на рэспубліканскі конкурс работ даследчага характару адбываецца па выніках абласной навукова-практычнай канферэнцыі навучэнцаў па прыродазнаўчых і сацыяльна-гуманітарных накірунках “Пошук”.




Выніковым на працягу 5-і гадоў у секцы ”Лінгвістыка” быў удзел у канферэнцыі юных даследчыкаў з Савецкага раёна, 4 апошнія гады – Светлагорскага раёна, двойчы – Ельскага, Калінкавіцкага і Жлобінскага раёнаў.

Прадстаўнікі астатніх раёнаў перамагалі толькі 1 раз. Лічбамі на слайдзе ўказана колькась работ.

Для абароны вынікаў сваіх даследаванняў у 2021 годзе адабраны 12 работ з 5-ці раёнаў вобласці: Акцябрскага, Гомельскага, Жыткавічскага, Рагачоўскага, Светлагорскага і Савецкага, Цэнтральнага і Чыгуначнага раёнаў Гомеля.




У секцыі "Літаратуразнаўства" штогадова пераможцамі станавіліся юныя даследчыкі таго ж Савецкага раёна, тройчы – Цэнтральнага раёна г.Гомеля.

Прадстаўнікі астатніх раёнаў заваёўвалі перамогу толькі аднойчы.

Для абароны даследчых работ у 2021 годзе адабраны 11 работ з 4-х раёнаў вобласці: Ельскага, Жлобінскага, Кармянскага, Светлагорскага, а таксама Савецкага, Цэнтральнага і Чыгуначнага раёнаў Гомеля.



Ні разу за 5 гадоў ні ў адной з секцый не змаглі атрымаць дыплом пераможцы прадстаўнікі Брагінскага, Буда-Кашалёўскага, Веткаўскага, Лоеўскага, Нараўлянскага, Петрыкаўскага раёнаў. Як правіла, іх работы насілі рэфератыўны характар, не адказвалі патрабаванням да афармлення вынікаў даследавання, мелі невысокі ўзровень унікальнасці работ, мелі неактуальную тэматыку.

Звярніце ўвагу на тэмы работ, прадстаўленых на слайдзе. Гэта тэмы, якія не з'яўляюцца актуальнымі для абласнога ўзроўню, як напрыклад, "Паходжанне і значэнні фразеалагізмаў", "Ад Аляксахінай да Ярмоленка", "Тапонімы вескі Букча Лельчыцкага раёна" і іншыя, ці не могуць быць разгледжаны ў секцыях "Лінгвістыка" ці "Літаратуразнаўства", бо ў іх не разглядваюцца моўныя або літаратуразначыя з'явы і працэсы. Гэта такія тэмы як "Папулярнасць беларускай мовы сярод моладзі", "Шлях да беларусаў падручніка «Беларуская мова»" "Мнеманічныя спосабы і прыёмы вывучэння беларускай мовы" і іншыя.

Пры падрыхтоўцы навучэнцаў да ўдзелу ў рэспубліканскім конкурсе работ даследчага характару кансультатыўную дапамогу аказваюць супрацоўнікі ГАІРА і выкладчыкі ўніверсітэта імя Ф.Скарыны. Паэтапна праводзяцца трэніровачныя зборы па падрыхтоўцы да конкурсу. Гэта заўсёды прыносіць свае вынікі. Такая мадэль падрыхтоўкі вучняў можа быць выкарыстана ў раёнах пры падрыхтоўцы да абласной канферэнцыі "Пошук". Звяртаем увагу на неабходнасць адбору работ строга ў адпаведнасці з парадкам работы секцый "Лінгвістыка" ці "Літаратуразнаўства", размешчаных у якасці дадатка да палажэння аб канферэнцыі. Для павышэння якасці падрыхтоўкі вучняў да даследчых конкурсаў запрашаем настаўнікаў наведваць летнюю школу.

Паважаныя калегі! Менавіта ад кожнага з нас залежыць паспяховасць кожнага вучня, выніковасць адукацыйнага працэсу па беларускай мове і літаратуры.Вы з'яўляецеся той кіруючай сілай, якая захапляе, вядзе за сабой, адраджае гонар і самасвядомасць маладога пакалення, прывівае любоў да матчынай мовы.

## Прыярытэтныя напрамкі дзейнасці па папулярызацыі беларускай мовы і пашырэнні сферы яе выкарыстання ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі Жлобінскага раёна

*Федарава Алена Леанідаўна,*
*загадчык ДУА "Жлобінскі раённ вучэбна-метадычны кабінет"*

У Жлобінскім раёне надаецца вялікая ўвага фарміраванню культурнага моўнага асяроддзя як часткі адукацыйнай прасторы. Вучэбныя прадметы "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура" займаюць адно з вядучых месцаў у сістэме адукацыі, бо мова з'яўляецца не толькі сродкам межасабовых зносін, але і сродкам разумення ўсяго навакольнага свету.

Усведамленне роднай мовы і літаратуры абумоўлена іх практычнай накіраванасцю і сарыентавана на рэалізацыю сучасных падыходаў. Таму прыярытэтнымі напрамкамі дзейнасці па папулярызацыі беларускай мовы і пашырэнні сферы яе выкарыстання з’яўляюцца забеспячэнне якасці арганізацыі адукацыйнага працэсу па вучэбных прадметах “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура”; пашырэнне сферы выкарыстання беларускай мовы праз арганізацыю пазаўрочнай дзейнасці.

Праца па пашырэнні выкарыстання, захавання беларускай культуры і мовы пачынаецца з дзіцячага сада.

На сёняшні дзень у раёне працуе:

40 установаў дашкольнай адукацыі, 5 з іх маюць беларускамоўныя групы,

33 установы сярэдняй адукацыі, 9 з якіх ажыццяўляюць адукацыйны працэс на беларускай мове.




Для педагагічных работнікаў дашкольных установаў адукацыі арганізаваны раённы фестываль педагагічных ідэй «Каб мова родная гучала», а дзеці могуць паспрабаваць свае сілы ў раённым конкурсе юнага чытальніка беларускай поэзіі «Родная мова, цудоўная мова»




Для пашырэння магчымасці атрымання беларускамоўнай адукацыі на ўсіх узроўнях ва ўстановах адукацыі раёна па жаданні вучняў і іх законных прадстаўнікоў арганізавана вывучэнне беларускай мовы і культуры маўлення

на факультатыўных занятках. Факультатывы па беларускай мове наведваюць 842 вучні.

У двух установах адукацыі ажыццяўляецца вывучэнне беларускай мовы на павышаным узроўні.




Праца па пашырэнні выкарыстання, захавання беларускай мовы адбываецца і падчас пазакласнай работы. І гэта не эпізадычная, а сістэмная работа, якая пачынаецца з пачатковай школы.

Так, штогод праводзіцца дыстанцыйны раённы конкурс “Разумнікі і разумніцы” сярод вучняў 4 класаў. Гэты конкурс не толькі спрыяе папулярызацыі беларускай мовы, але і носіць прапедэўтычны характар – удзельнікі гэтага конкурса потым прымаюць удзел у абласной алімпіядзе па беларускай мове і літаратуры сярод вучняў 4-9 класаў. А ўдзел у алімпіядзе – адзін з напрамкаў фарміравання уменняў валодання беларускай мовай.

Традыцыйна кожны год у лютым ва ўсіх установах адукацыіі праводзіцца Тыдзень беларускай мовы і літаратуры. Падчас правядзення тэматычных прадметных тыдняў наладжана ўзаемадзеянне настаўнікаў, вучняў і бацькоў.




На працягу апошніх двух гадоў для вучняў 7-8, 9-11 класаў прапануецца раённая онлайн-віктарына “Мова – гэта стылёва”. Гэта віктарына можа стаць брэндам Жлобінскага раёна.




З мэтай павышэння цікавасці да роднай мовы і культуры, развіцця даследчых уменняў вучняў праводзіцца раённы конкурс даследчых работ па беларускай мове і літаратуры, этнаграфіі.

Навучэнцы нашага раёна паказваюць высокі ўзровень падрыхтоўкі і з'яўляюцца пераможцамі абласных інтэлектуальных і творчых конкурсаў ("Ведай родную мову", "Захаваем свет разам", канферэнцыя "Пошук" і інш.)

Ва ўстановах адукацыі арганізаваны аб'яднанні вучняў па інтарэсах: "Спадчына", "Валошкі" ,"Краязнаўства", "Беларусазнаўства", "Вербіца" іншыя.




На базе 15 ўстаноў адукацыі дзейнічаюць музеі, музейныя пакоі краязнаўчага, этнаграфічнага напрамку. Правядзенне ўрокаў на іх базе стала традыцыйным і дазваляе вучням дакрануцца да падзей даўно мінулых дзён.

Асновай развіцця вучня, павышэння цікавасці да свайго прадмета з'яўляецца настаўнік. Таму важную ролю ў сістэме адукацыі раёна адыгрывае стварэнне ўмоў і забеспячэнне асобасна-прафесійнага развіцця педагога, удасканальвання педагагічнага майстэрства для паспяховай рэалізацыі задач, якія стаяць перад сучаснай школай.

Каб цікава выкладаць прадмет, выкарыстоўваць разнастайныя метады, прыемы, формы работы настаўнікі павышаюць свой прафесійны узровень як на курсах павышэння кваліфікацыі, так і ў міжкурсавы перыяд.

Семінары, інструктыўна-метадычныя нарады праводзяцца як у рэжыме аффлайн, так і анлайн, што дазваляе ахапіць адразу амаль усіх настаўнікаў, усіх установ адукацыі раёна.

У раёне надаецца вялікая ўвага ўдасканальванню прафесійнага майстэрства праз арганізацыю правядзення конкурсаў, майстар-класаў і іншых формаў трансляцыі прадуктыўнага педагагічнага вопыту.




Напрыклад, раённы конкурс распрацовак урокаў беларускай мовы і літаратуры “Як 45 хвілін пралятаюць за 5: лепшыя ўрокі на канкрэтным прыкладзе”, фестываль педагагічных ідэй “Вывучэнне беларускай мовы і літаратуры: традыцыі і інавацыі”. Так, удзельнікі фестывалю прадстаўляюць сення свой вопыт.

Прымаюць удзел настаўнікі раёна і ў правядзенні абласных мерапрыемстваў, дзеляцца вопытам на курсах павышэння кваліфікацыі.

Пераможцам абласнога і лаўрыятам I ступені ў намінацыі “Беларуская мова і літаратура. Руская мова і літаратура” заключнага этапу рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства педагагічных работнікаў “Настаўнік года Рэспублікі Беларусь” у 2020 годзе стала Смарцэлава Наталія Дзмітрыеўна, настаўнік гімназіі №1 г.Жлобіна.

Эфектыўнымі спосабамі трансляцыі прадуктыўнага педагагічнага вопыту з’яўляецца выкарастанне рэсурсаў сеткі Інтэрнэт. Настаўнікамі раёна шырока выкарыстоўваюцца матэрыялы сайтаў Міністэрства адукацыі, Нацыянальнага інстытута адукацы, Акадэміі паслядыпломнай адукацыі.

Даведацца аб навінах у сістэме адукацыі раёна дазваляе сайт аддзела адукацыі, раённага метадычнага кабінета. Таксама там размяшчаюцца матэрыялы семінараў, метадычныя распрацоўкі ўрокаў і мультымедыйныя прэзентацыі, якія настаўнікі могуць выкарыстоўваць пры правядзенні ўрокаў, арганізацыі пазакласнай дзейнасці, пры рабоце з высокаматываванымі і інтэлектуальна адоранымі вучнямі пры падрыхтоўцы да алімпіяд і конкурсаў, цэнтралізаванага тэсціравання.

У раёне накоплены цікавы вопыт стварэння беларускамоўнай прасторы, выкладання беларускай мовы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі.

## Эфектыўныя прыёмы візуалізацыі вучэбнай інфармацыі пры вывучэнні вучэбных прадметаў “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура”

*Смарцэлава Наталія Дзмітрыеўна,*
*настаўнік беларускай мовы і літаратуры*
*ДУА “Гімназія №1 г.Жлобіна”*

Падзялюся вопытам выкарыстання прыёмаў візуалізацыі на ўроках беларускай мовы і літаратуры, а таксама ў пазакласнай рабоце.

Нагадаю, что слова “візуальны” лацінскага паходжання і азначае “той, які ўспрымаецца зрокава, наглядны”.

Адразу ўзгадваецца тэрмін “нагляднасць”, які быў яшчэ нядаўна надзвычай папулярны. Тэрміны “нагляднасць” і візуалізацыя не з’яўляюцца сінонімамі. Паняцце “візуалізацыя” значна шырэйшае.

З некалькіх найбольш папулярных у наш час азначэнняў я выбрала тое, што даў расійскі псіхолаг Андрэй Аляксандравіч Вярбіцкі: “Візуалізацыя – згортванне разумовага зместу ў наглядны вобраз; пасля ўспрымання вобраз можа быць разгорнуты і служыць апорай адэкватных разумовых і практычных дзеянняў”.

Для сябе я вызначыла ў гэтым азначэнні тры ключавыя словы: згортванне (магчымасць з вялікага зрабіць малое), наглядны (магчымасць убачыць), дзеяняў (магчымасць актыўных дзеянняў для вучня).

Гэта і ёсць, на маю думку, асноўныя крытэрыі візуалізацыі.




Перад вамі інтэлект-карта, пры дапамозе якой я паказала некаторыя эфектыўныя прыёмы, спосабы і сродкі візуалізацыі вучэбнага матэрыялу, якія выкарыстоўваю ў сваёй рабоце.

На ўроках беларускай мовы я выкарыстоўваю логіка-сэнсавыя мадэлі, памяткі і дэфармаваны тэкст у спалучэнні з прыёмамі “Воблака слоў” і “Лексічнае лато”.

Дэфармаваны тэкст, з якім працую я,  не дэфармаваны, як звычайна, нейкімі скажэннямі (напрыклад, парушэннем паслядоўнасці сказаў, памылкамі) – ён дэфармаваны малюнкамі, ілюстрацыямі.

Працуючы з дэфармаваным тэкстам, вучні павінны выправіць дэфармацыю – замяніць малюнкі адпаведнымі словамі.




На ўроку беларускай мовы ў шостым класе па тэме “Назоўнік як часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Пачатковая форма” вучні атрымліваюць дэфармаваны тэкст і заданне да яго: запішыце тэкст, замяняючы малюнкі словамі, вызначце сінтаксічную ролю гэтых слоў.

Дэфармаваны тэкст выглядае наступным чынам. Такія тэксты я звычайна пішу сама, кіруючыся тым, з якімі словамі хачу пазнаёміць вучняў.




Давайце прачытаем тэкст разам:

Сярод зарасніку шыпшыны стаіць альтанка. У ёй ля стала з белым абрусам разлівае ў кубкі каву дзяўчына незвычайнай прыгажосці. Яе сукенка колеру бэзу здаецца яскравай плямай на фоне пяшчотнай зеляніны. У засені дрэў схаваўся плецены фатэль, у якім хтосьці пакінуў свой капялюш.

Зразумела, што шасцікласнікі не выканаюць заданне без падказкі. Яна ў мяне заўсёды прадугледжана. Гэта воблака слоў. У ім усе словы, якімі неабходна замяніць ілюстрацыі, каб пазбегнуць дэфармацыі тэксту.

Каб ускладніць заданне (напрыклад, пры рабоце з вучнямі па падрыхтоўцы да алімпіяды), можна дадаць у воблака лішнія словы.




Другім варыянтам падказкі для вучняў можа быць прыём “Лексічнае лато”. Гэта невялікія папяровыя карткі двух відаў: на адных з іх выявы, на другіх – адпаведныя словы. Сабраўшы пары, вучні атрымліваюць апору для работы з тэкстам.




Пры гэтым заданне можна прапанаваць у выглядзе індывідуальнай, парнай, групавой і калектыўнай форм работы. Да картак можна звярнуцца і на наступных уроках. Прыёмы “Дэфармаваны тэкст”, “Воблака слоў, “Лексічнае лато” ў такім выглядзе эфектыўныя пры падрыхтоўцы вучняў да алімпіяды.

На ўроках беларускай літаратуры станоўчыя вынікі дае выкарыстанне плаката (як інтэрактыўнага, так і папяровага), ілюстрацый да твораў (намаляваных вучнямі ці падабраных у выглядзе карцін, фатаграфій і кадраў фільма ці мультфільма), а таксама інтэлект-карта, якую можна ствараць да твора, да асобы, да пэўнага перыяду развіцця літаратуры.

Сёння я падрабязней спынюся на прыёме “Ілюстратары”, сутнасць якога ў стварэнні ці падборы ілюстрацый да твора.

Прыём прадугледжвае розную ступень самастойнасці вучняў: ад стварэння ўласных ілюстрацый да падбору ілюстрацый з прапанаваных настаўнікам.

Пры вывучэнні верша Рыгора Барадуліна “Трэба дома бываць часцей” прапаноўваю васьмікласнікам  ілюстрацыі, якія трэба суаднесці са строфамі верша.




Перад вамі падабраныя настаўнікам (для эканоміі часу) ілюстрацыі, у аснову якіх пакладзены нейкі запамінальны зрокавы вобраз, што прысутнічае ў кожнай страфе верша: бохан хлеба, асвер, сцежка ад роднага дома. Для выканання задання неабходна правесці работу па ўсведамленні вучнямі  ідэі твора. А ідэя верша  выказана ў яго назве: трэба дома бываць часцей, каб захаваць найважнейшыя жыццёвыя каштоўнасці (незабыўную памяць пра родны дом, маці і бацьку, дзяцінства).




Вось такі выгляд мае выкананае заданне. Візуалізаваныя вобразы верша не проста ілюструюць яго, спрыяюць асэнсаванню праблемы твора, але і дапамагаюць у завучванні твора на памяць.

Прыём “Ілюстратары” можна выкарыстоўваць у спалучэнні з прыёмам “Чацвёртае лішняе”, калі метадам выключэння вучні выбіраюць ілюстрацыю да

твора, якая адпавядае яго зместу. Так, на ўроку па апавяданні “Дзяльба кабанчыка” Віктара Карамазава вучні атрымліваюць заданне выбраць з чатырох прапанаваных партрэтаў жанчын той, які можа быць партрэтам галоўнай гераіні.

Пры падборы ілюстрацый настаўнік у першую чаргу павінен аддаваць перавагу творам беларускіх мастакоў - класікаў жывапісу. Абавязкова ўказваць назву твора, імя мастака. Такое ж патрабаванне павінна быць і да ілюстрацый, падабраных вучнямі.




Перад вамі варыянт ілюстрацый да задання. Вучні з лёгкасцю вызначаюць партрэт (першы). Папрасіце абгрунтаваць іх свой выбар, растлумачыць, па якіх параметрах не падыходзяць астатнія тры партрэты.

Аналагічную работу можна праводзіць з творамі пейзажнай лірыкі, калі патрабуецца знайсці сярод прапанаваных пейзажаў беларускіх мастакоў “чацвёрты лішні”. Такую работу праводзіла пры вывучэнні ўрыўка з паэмы Якуба Коласа “Сымон-музыка” “О, край родны, край прыгожы” ў восьмым класе.




Перад вамі варыянт ілюстрацый да задання. Гэта чатыры пейзажы беларускіх мастакоў у розныя поры года. Вучні звычайна і звяртаюць увагу

менавіта на гэта, але "чацвёртым лішнім" з'яўлаецца твор Барыса Аракчэева "Снежны дзянёк", бо на ім гарадскі пейзаж.

Пры дапамозе прыёма "Ілюстратары" можна падвесці вучняў да разумення аўтарскай задумы, да ўсведамлення сэнсу назвы твора. Пры вывучэнні драмы Аляксея Дударава "Вечар" пры дапамозе пейзажаў беларускіх мастакоў прапаноўваю суаднесці этапы жыцця чалавека з адпаведным часам сутак.




Перад вамі варыянт ілюстрацый да задання. На пейзажах мы бачым раніцу, дзень, вечар і ноч. На картках – чатыры словы - адпаведныя этапы жыцця чалавека. Візуалізыцыя спрыяе таму, што вучні хутка ўсведамляюць аўтарскую задуму і злучаюць патрэбныя выявы са словамі.




Так выглядае правільны адказ. Вучні, уражаныя метафарычнасцю выразу "дзень дагарае", пачынаюць яго ўжываць у сваім маўленні пры характарыстыцы вобразаў драмы "Вечар".

На ўроках пры вывучэнні гэтага ж твора можна выкарыстаць невялікае лато (як у папяровым, так і ў лічбавым варыянце). Яно прадугледжвае размеркаванне прадметаў паміж героямі, што дае магчымасць для характарыстыкі персанажаў твора.




Напрыклад, 6 прадметаў прапаную размеркаваць паміж трыма героямі: Ганнай, Мульцікам і Гастрытам. Заданне можна прапанаваць у індывідуальнай, парнай, групавой формах работы на этапе першаснага замацавання ведаў.




Правільна выкананае заданне выглядае наступным чынам. Называючы прыналежнасць прадмета пэўнаму герою, вучні адказваюць на пытанні: Чаму прадмет належыць менавіта гэтаму герою? Чаму прадмет не можа належаць іншаму герою? Такім чынам высвятляю, наколькі ўважлівыя вучні былі пры чытанні тэксту, вызначаю шляхі далейшага ўзаемадзеяння на ўроку.



Пры падрыхтоўцы вучняў да алімпіяды станоўчы вынік мае выкарыстанне флэш-картак (фізічных і ў лічбавым варыянце), логіка-сэнсавых мадэляў, кластараў і табліц, прызначэнне якіх згортваць вялікі па аб’ёме матэрыял.

Для запамінання інфармацыі пра пісьменнікаў мы з вучнямі ствараем флэш-карткі. Што такое флэш-картка? Гэта папяровая ці пластыкавая картка, на двух баках якой змешчана інфармацыя. У нашым выпадку з аднаго боку партрэт, з другога - кароткія звесткі пра біяграфію і творчасць пісьменніка.




Карткі могуць існаваць і ў лічбавым варыянце. Каб стварыць лічбавыя карткі, можна карыстацца спецыяльнай праграмай Куізлет. Яна дазваляе нават агучыць картку. Гэта можна выкарыстоўваць пры стварэнні картак для работы з акцэнталагічнымі і арфаэпічнымі нормамі. Звяртаю ўвагу на тое, што карыстанне праграмай платнае.




Флэш-карткі можна стварыць і пры дапамозе Гугл-прэзентацый.




ПауэрПоінт таксама дазваляе зрабіць флэш-карткі ў выглядзе прэзентацыі з гіперспасылкамі.

Лічбавыя флэш-карткі – гэта магчымасць уключаць вучняў у працэс стварэння прадукта і варыянт дыстанцыйнай работы з вучнямі.

Візуалізацыя вучэбнай інфармацыі робіць працэс навучання болш інтэнсіўным, актывізуе вучэбную і пазнавальную дзейнасць, фарміруе крытычнае мышленне. Несумненна, уключэнне вучня ў актыўную дзейнасць па візуалізацыі вучэбнага матэрыялу спрыяе павышэнню яго візуальнай граматнасці і візуальнай культуры.

Кожны настаўнік выбірае свае формы візуалізацыі вучэбнага матэрыялу. Несумненна адно: візуалізацыя на ўроку неабходна, бо абумоўлена не толькі патрабаваннямі вучэбных праграм, але і ўзроставымі асаблівасцямі вучняў.

## Фарміраванне лінгвакультуралагічнай кампетэнцыі вучняў або Як захоўваць каштоўнасці нацыянальнай культуры

*Аўласцова Наталья Міхайлаўна,*
*настаўнік беларускай мовы і літаратуры*
*ДУА “Гімназія №1 г.Жлобіна”*

У сваёй педагагічнай дзейнасці часта сутыкалася з наступнай праблемай: значная частка вучняў не разумее значэння большасці беларускіх слоў, самабытных фразеалагізмаў; прыказкі, прымаўкі вучні тлумачаць з цяжкасцю, абсалютная большасць вучняў не арыентуецца ў беларускіх абрадах і традыцыях, не ведае пра традыцыйныя заняткі нашых продкаў. Як навучыць школьнікаў не толькі бачыць пэўную моўную з’яву, але і сутнасць сказанага?

Вырашэнню гэтай праблемы спрыяе лінгвакультуралагічны падыход да навучання роднай мове, згодна з якім у змест навучання ўключаецца матэрыял з нацыянальна маркіраванымі моўнымі адзінкамі, заданні на выяўленне адметнага і агульнага ў беларускай, рускай і іншых мовах. Работа з заданнямі, тэкстамі культуралагічнага характару дазваляе настаўніку не толькі

фарміраваць арфаграфічныя і пунктуацыйны навыкі, але і далучаць вучняў да гісторыі, духоўнай культуры свайго народа, традыцый і здабыткаў.




Падзялюся вопытам фарміравання культуралагічнай кампетэнцыі вучняў.



1. Вызначце тып скланення назоўнікаў, пастаўце іх у месным склоне.

| Слова | Тлумачэнне | Тып скланення | Месны склон |
|---|---|---|---|
| свякроў | маці мужа | | |
| цесць | бацька жонкі | | |
| цешча | маці жонкі | | |
| дзевер | брат мужа ў адносінах да яго жонкі | | |
| дзядзіна | жонка дзядзькі | | |
| дзядзька | бацькаў ці матулін брат | | |

Разгледзем заданне да раздзела “Марфалогія”. Дадзенае заданне можна выкарыстоўваць пры вывучэнні тэмы “Асаблівасці правапісу канчаткаў назоўнікаў 1-га і 2-га скланення ў месным склоне” ( 6 клас). Вучням прапаноўваецца запоўніць табліцу, вызначыць тып скланення назоўнікаў, паставіць іх у месным склоне. Звярніце ўвагу на наяўнасць слупка пад назвай “Тлумачэнне”. Варыянты працы з гэтым моўным матэрыялам могуць быць разнастайнымі: можна даць тлумачэнне слоў у гатовым выглядзе, як прадстаўлена ў заданні на слайдзе, і такім чынам даць магчымасць вучням пазнаёміцца з гэтымі паняццямі; другі варыянт – вучні самі тлумачаць дадзеныя словы пры дапамозе тлумачальнага слоўніка, трэці варыянт –пераблытаць тлумачэнні дадзеных паняццяў, каб вучні суаднеслі словы з іх значэннем. Такая работа дапамагае вучням засвоіць сістэму сваяцкіх адносін беларусаў. Заданне можна выкарыстоўваць як на этапе замацавання ведаў і развіцця навыкаў і ўменняў вучняў, так і на этапе актуалізацыі ведаў вучняў.

**2. Дапішыце сказы, раскрыўшы значэнне ўжытых слоў.**

А. У склад хамута ўваходзяць клешчы – …

Б. Ніжнія канцы клешчаў сцягваюцца на шыі каня супоняю – ...

В. Хамут мае па баках гужы – ...

Г. Да спіны каня шчыльна прылягае падсядзёлак – …

Д. Да аброці, надзетай на галаву каня, мацуюцца лейцы – …

| | |
|---|---|
| а) клешчы | 1. тонкі скураны пасак. |
| б) супоня | 2. скураная ці вераўчаная пятля ў хамуце, каб трымаць дугу і аглоблі |
| в) гуж | 3. вяроўкі ці рамяні для кіравання коньмі ў запрэжцы. |
| г) падсядзёлак | 4. драўляны каркас, абкладзены знутры мяккім валікам з воўны. |
| д) лейцы | 5. скураная падушка на лямцавай падкладцы. |

Заданне да раздзела “Сінтаксіс і пунктуацыя” выкарыстоўваю пры вывучэнні тэмы “Сказы з адасобленымі прыдаткамі, знакі прыпынку” (8 клас). Вучням прапаноўваецца дапісаць сказы, раскрыўшы значэнне ўжытых слоў. Значэнні слоў *клешчы, супоня, гуж, падсядзёлак, лейцы* патрэбна знайсці ў даведачнай табліцы. Заданне можна выкарыстоўваць на этапе першаснага замацавання ведаў і фарміравання ўменняў вучняў, магчымы варыянт і на этапе ўвядзення новага вучэбнага матэрыялу. Матэрыял задання дапамагае раскрыць лексічнае значэнне слоў – назваў рэалій вясковага побыту.

**3. Вызначце стыль тэксту. Па апісанні вызначце, пра што ідзе гаворка ў сказах.**

1. У народных вераваннях ён выступаў сімвалам дарогі, шляху. Зняўшы яго, чалавек далучаўся да таго свету, меў магчымасць уступіць з ім у кантакт.

2. Яго дзяўчаты пачыналі насіць толькі пасля дасягнення паўналецця. Ён увасабляў ідэю нараджэння – у яго кідалі чарапкі, каб бясплодная жанчына магла зацяжарыць, ім выціралі сурочаных дзетак.

3. Ён меў найвышэйшы сімвалічны статус сярод адзення. Яго рытуальнае выкарыстанне пачыналася з першых хвілін жыцця чалавека і працягвалася да самай смерці. На яго клалі нованароджанае дзіця, на яго садзілі малое ў час першага падстрыгання. Маладыя сядзелі на ім за вясельным сталом. На яго паўсюдна клалі толькі што памерлага чалавека.

4. Ён гарантуе абарону ад небяспекі з боку знешняга свету. Без яго мужчына ўспрымаўся як сацыяльна непаўнацэнны. Яго здымаюць у прысутнасці нябожчыка, што сімвалізуе духоўны кантакт з памерлым.

5. Ён яскравы элемент жаночага строю. Без яго замужнія жанчыны не мелі права з’яўляцца за межамі хаты. Насіць яго трэба было, каб не трапіць пад уздзеянне нячыстай сілы.

Наступнае заданне да раздзела “Стылістыка”. Са стылямі маўлення мы сустракаемся ў кожным класе, таму дадзенае заданне можна выкарыстоўваць як пры азнаямленні вучняў са стылямі маўлення ў сярэдніх класах, так і пры замацаванні ведаў вучняў пра стылі маўлення ў старэйшых класах. Вучням прапаноўваецца вызначыць стыль тэксту і па апісанні зразумець, пра што ідзе гаворка ў сказах. Вучні аналізуюць змешчаную ў тэкстах інфармацыю і знаёмяцца як з прадметамі побыту беларусаў, так і з іх прызначэннем.



**4. Спалучыце часткі фразеалагічных адзінак са слупкоў 1 і 2, каб стварыць адну правільную фразему. Запішыце варыянты, якія атрымаліся, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы патрэбныя літары.**

| 1 | 2 |
|---|---|
| бачыў бог | да (В,в)ялікадня |
| дарагое яечка | нагам (не)спакой |
| (да)спадобы | што не даў сві(н,нн)і рог |
| за дурной галавой | скуру купляць |
| на жывым мядз…ведзі | не ра(с,сс)ячэш |
| пугаю кавадла | прыпасці |

Заданне з раздзела “Фразеалогія”можна выкарыстоўваць пры вывучэнні тэмы “Паняцце пра фразеалагізмы. Роля фразеалагізмаў у маўленні” (5 клас) на этапе замацавання ведаў і развіцця навыкаў і ўменняў вучняў. Вучням прапаноўваецца спалучыць часткі фразеалагічных адзінак са слупкоў 1 і 2, каб стварыць адну правільную фразему. Запісаць варыянты, якія атрымаліся, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы патрэбныя літары, і растлумачыць значэнне фразеалагізмаў. Такім чынам, настаўнік не толькі фарміруе арфаграфічныя навыкі вучняў, але і далучае іх да духоўнай скарбніцы нашага народа. Пры гэтым вучні знаёмяцца са значэннем такіх слоў, як *Вялікдзень, пуга, кавадла*. Работу з дадзенымі словамі настаўнік можа арганізаваць па-рознаму: можна звярнуцца да тлумачальнага слоўніка і вызначыць значэнне дадзеных слоў, настаўнік можа сам растлумачыць значэнне гэтых слоў, можна даць вучням у якасці дамашняга задання знайсці значэнне слоў.



Наступнае заданне да раздзела “Лексіка”. Я прапаноўваю яго ў выглядзе дэфармаванага тэксту. Вучням патрэбна прачытаць тэкст, замяніўшы малюнкі адпаведнымі словамі. Калі ў вучняў узнікаюць цяжкасці пры выкананні задання, прапаноўваю звярнуцца да даведкі. Такім чынам настаўнік знаёміць вучняў з самабытнымі беларускімі словамі. Заданне можна выкарыстоўваць, напрыклад, пры вывучэнні тэмы “Лексічнае значэнне слова” (5 клас) на розных этапах урока.

**6. Запоўніце табліцу.**

| *Утваральная аснова* | *Вытворнае слова* | *Значэнне* | *Спосаб утварэння* |
|---|---|---|---|
| **сенаваць** | сенаванне | нарыхтоўка сена | суфіксальны |
| | падсітак | невялікае сіта | |
| **заціраць** | | вадкая страва з мукі, заваранай дробнымі камячкамі | |
| | вазоўня | | суфіксальны |
| **дровы** | | месца, памяшканне, дзе сякуць і складваюць дровы | |

Пры вывучэнні спосабаў утварэння слоў выкарыстоўваю вучням прапаноўваецца запоўніць табліцу з белымі плямамі, правесці словаўтваральны разбор слоў, далучыўшыся такім чынам да вытокаў беларускага слова. Пры ўзнікненні цяжкасцей запаўняць слупок “Значэнне слова” рэкамендую вучням пры дапамозе тлумачальнага слоўніка. Заданне прапаноўваю выкарыстоўваць на этапе замацавання ведаў і развіцця навыкаў і ўменняў вучняў.

Асаблівасць прапанаваных заданняў у тым, што іх можна напоўніць любым моўным матэрыялам у залежнасці ад вывучаемай тэмы. Такія заданні выкарыстоўваю пры падрыхтоўцы вучняў да алімпіяды, пры гэтым, зразумела, ускладняю іх. Гэта дазваляе маім вучням быць паспяховымі на алімпіядзе.

## Метад “пяць пальцаў” як сродак візуалізацыі вучэбнай інфармацыі на ўроках беларускай мовы для фарміравання якасных ведаў вучняў

*Сяліцкая Таццяна Георгіеўна,*
*настаўнік беларускай мовы і літаратуры*
*ДУА “Сярэдняя школа №7 г.Жлобіна”*

Метад “Пяць пальцаў” быў распрацаваны бізнес-трэнерам Бадо Шэферам і напачатку прымяняўся толькі як сродак ацэнкі вынікаў уласнай дзейнасці чалавека, рэфлексіі. Пазней метад быў удасканалены аратарам Лотарам Зайверам і псіхолагам Мікалаем Казловым.




Метад з’яўляецца мнематэхнікай і заключаецца ў тым, што першая літара назвы кожнага пальца асацыіруецца з пэўным словам-параметрам, па якім інеабходна аналізаваць вынікі сваёй дзейнасці па дасягненні той ці іншай мэты.

На маю думку, дадзены метад вельмі проста запомніць і пачаць прымяняць яго спачатку на такім этапе ўрока, як рэфлексія. Так некалі зрабіла і я. Загадзя раздрукавала апорныя схемы ў выглядзе рукі і раздала вучням. Аналізуючы вынікі сваёй дзейнасці на ўроку яны працягвалі прапанаваныя ў схеме выказванні: “Я ведаю…”, “Я умею…”, “Я адчуваю”, “Я буду прымяняць…”. “Я магу падзяліцца…”




Праз пэўны час я даведалася, што сучасныя настаўнікі пачалі выкарыстоўваць метад “Пяць пальцаў” больш шырока. Напрыклад, падчас падрыхтоўкі выпускнікоў да экзамену ў выглядзе цэнтралізаванага тэсціравання. Прымяняючы гэты мнематычны метад, праводзицца работа па абагульненні і сістэматызацыі вучэбнага матэрыялу. Вучні на лістах паперы абводзяць сваю руку і запаўняюць атрыманую фігуру неабходнымі звесткамі, згодна з наступнай схемай: мезены палец- гук(літара) → безыменны - склад → сярэдні-слова→ указальны-словазлучэнне→ вялікі палец- сказ→ кулак-тэкст. Уздоўж пальцаў запісваюцца назвы раздзелаў лінгвістыкі (фанетыка, лексіка, словаўтварэнне, граматыка і стылістыка і інш), звязаныя з тым ці іншым моўным кампанентам (гук- фанетыка, арфаэпія і г.д.).




Мой вопыт паказвае, што метад “Пяць пальцаў” можна прымяняць на ўсіх этапах ўрока беларускай мовы, бо ён з’яўляецца эфектыўным сродкам візуалізацыі вучэбнай інфармацыі, што спрыяе не толькі фарміраванню якасных ведаў вучняў, але і эканоміі часу на ўроку. З улікам канкрэтных вучэбных задач я ці раздаю вучням запоўненыя апорныя схемы “Пяць пальцаў” (напрыклад для іх аналізу), ці арганізоўваю работу вучняў па іх запаўненню падчас знаёмства з новым матэрыялам, ці, выкарыстоўваючы прыём “белыя плямы”, праводжу работу па абагульненні і сістэматызацыі ведаў.

Так, пры тлумачэнні новага матэрыялу ў 5 класе па тэме “Стылі маўлення” раздаю вучням гатовую апорную схему ў выглядзе пяці пальцаў, яна дапамагае вучням запомніць, што стыляў 5, што 4 з іх кніжныя, а 1- някніжны. На апошнім ўроку па вывучэнні гэтай тэмы таксама раздаю гэту схему, толькі пустую і прапаную вучням самастойна ўпісаць назвы стыляў маўлення.

У тым жа 5 класе мнеманічны метад “Пяць пальцаў” дапамагае вучням запомніць, што членаў сказа 5, што 2 з іх галоўныя, а астатнія даданыя. На этапе знаёмства з новым мэтэрыялам раздаю пустыя апорныя схемы, у які вучні ўпісвюць назвы членаў сказа і падкрэсліваюць гэтыя назвы ўмоўнымі графічнымі лініямі: дзейнік адной суцэльнай, выказнік – дзвюма, дапаўненне – пункцірам, акалічнасць – штрых-пункцірам, а азначэнне – хвалістай лініяй.




Эфектыўным, на маю думку, з’яўляецца метад “Пяць пальцаў” пры вывучэнні тэмы “Правапіс ў” у 5 класе. Раздаю апорныя схемы, у якіх

прапушчаны галосныя, вучні працуюць у парах, узгадваюць галосныя, запісваюць іх у схему, потым заёмяцца з правілам, аналізуюць схему і агучваюць правіла. Выкарыстанне гэтай жа схемы ў старэшых класах дапамагае хутка актуалізаваць веды вучняў па тэме "Правапіс ў".




Складанне апорных схем "Пяць пальцаў" з'яўляецца эфектыўным сродкам і падчас работы па ўзбагачэнні слоўніка вучняў новымі лексічнымі адзінкамі, раскрыцці і ўдакладненні сэнсавага значэння слова, яго правільнага ўжывання ў вусным і пісьмовым маўленні. Даю вучням індывідуальнае дамашняе заданне правесці міні-даследаванне і вызначыць лексічнае значэнне аднаго слова з пэўнай тэматычнай групы. На ўроку вучні агучваюць вынікі сваёй работы і ў групах па 5 чалавек складаюць апорную схему. Напрыклад, пры вывучэнні тэмы "Запазычаныя словы, іх ужыванне і правапіс" у 5 класе даю заданне вызначыць лексічнае значэнне слоў 'футбол', 'гандбол', 'бескетбол', 'валейбол', 'бейсбол' з указаннем краіны паходжання слова. У выніку дзеці вызначаюць, што ўсе гэтыя словы прыйшлі з англійскай мовы, ў сваім складзе маюць агульную частку бол (ball=мяч) і з'яўляюцца назвамі відаў спорту з мячом, потым афармляецца апорная схема "Віды спорту з мячом". На аснове сабранага матэрыялу складаюцца славазлучэнні, сказы, тэксты.




Выкарыстоўваю метад "Пяць пальцаў" пры вывучэнні тэмы "Займеннік" у 6 класе. Прапаную вучням прачытаць правіла ў падручніку і тэкставую

інфармацыю аформіць у выглядзе апорнай схемы, пустыя схемы раздаю загадзя.




У выніку вучні атрымоўваюць гатовы прадукт – апорную схему “Агульнае значэнне займенніка”, якая дапамагае ім зразумець і запомніць складаны тэарэтычны матэрыял.




Эфектыўным з’яўляецца выкарыстанне апорных схем і пры арганізацыі паўтарэння тэарэтычнага матэрыялу пры падрыхтоўцы вучняў старэйшых класаў да выпускных экзаменаў і цэнтралізаванага тэсціравання. Апорныя схемы дазваляюць якасна правесці актуалізацыю і сістэматызацыю ведаў за некалькі хвілін. Калі выкарыстанне апорных схем у рабоце з вучнямі з’яўляецца сістэмным, то вучням старэйшых класаў многія з іх ўжо добра вядомы, таму ўзнавіць веды няцяжка. Напрыклад, у апорнай схеме “Часціны мовы”, якую я загадзя раздрукоўваю, апускаюцца некаторыя элементы, якія вучням неабходна успомніць і самастойна ўпісаць. Па выбары настаўніка можна апусціць назвы часцін мовы, можна пытанні, можна прыклады.

Дапамагае гэты метад арганізаваць работу вучняў і пры развіцці іх звязнага маўлення. Я паказваю або называю які-небудзь прадмет і даю заданне падабраць да яго азначэнні і запісаць іх на картку з адбіткам рукі, на кожны палец па адным слове, а потым з гэтымі словамі скласці сказ, тэкст. Праводжу такую работу з вучнямі рознага ўзросту.




Метад "Пяць пальцаў" дае магчымасць настаўніку творча падыходзіць да яго прымянення з улікам канкрэтных вучэбных задач. Візуалізацыя вучэбнага матэрыялу дазваляе выпрацоўваць у вучняў уменне аналізу, абагульнення і сістэматызацыі аб'ёмнай інфармацыі, спрыяе паспяховай сацыялізацыі вучняў. Хачу адзначыць, што ў такую працу актыўна уключаюцца і вучні з нізкай вучэбнай матывацыяй. Аднак трэба ўлічваць і тое, што складанне апорнай схемы– няпростая творчая задача, якая патрабуе ад настаўніка наяўнасці здольнасцей да абагульнення і абстрагавання, глыбокага ведання матэрыялу.

## Забеспячэнне якаснага ўспрымання і засваення вучэбнага матэрыялу на ўроках беларускай мовы і літаратуры праз выкарыстанне сродкаў візуалізацыі

*Яўсеенка Ірына Віктараўна,*
*настаўнік беларускай мовы і літаратуры*
*ДУА "Рэчыцкі раённы ліцэй"*

Існуе шырокая разнастайнасць традыцыйных спосабаў візуалізацыі на ўроках беларускай мовы і літаратуры для забеспячэння якаснага ўспрымання і засваення вучэбнага матэрыялу. Я спынюся на некаторых.

Першы сродак візуалізацыі — воблака слоў. Воблака слоў — гэта візуальнае прадстаўленне спісу катэгорый, якія яшчэ называюць ярлыкамі, ключавымі словамі. Можна выкарыстоўваць для стварэння воблака слоў наступныя сервісы **Tagxedo.com**, **Tagul.com**, **Wordle.net**.

У навучальным працэсе воблака слоў можна выкарыстоўваць на розных этапах урока: паведамленне тэмы, мэтавызначэнне і матывацыя, актуалізацыя ведаў, вывучэнне новага матэрыялу,замацаванне матэрыялу. Воблака ўтрымлівае яскравае і арыгінальнае афармленне.

Згенераванае воблака слоў можна выкарыстоўваць у электронным выглядзе, а можна раздрукаваць на прынтары і выкарыстоўваць у якасці раздатачнага матэрыялу, можна вывесці яго на экран або інтэрактыўную дошку.




Можна прапанаваць вучням у залежнасці ад тэмы розныя віды заданняў:скласці сказы,улічваючы прыведзеныя словы, скласці тэкст, выпісаць назоўнікі , размеркаваўшы іх па зададзеных настаўнікам крытэрыях.




Можна прапанаваць уаднесці словы, выпісаць гістарызмы, архаізмы.




На этапе замацавання ці кантролю ведаў воблака слоў утрымлівае асноўныя паняці па дадзенай тэме, таму вучням можна прапаваць узнавіць правіла з прапанаваных слоў, выключыўшы непатрэбнае.




Прымяняю воблака слоў для арфаграфічнай размінкі: прапаную з прыведзеных слоў выпісаць тыя, якія адпавядаюць арфаграфічным нормам, выправіць памылкі і сфармуляваць правіла, якое аб’ядноўвае дадзеныя словы.

Літаратуру немагчыма ўкласці ў схему, але ўпрыгожыць ёю урок можна паспрабаваць.




Напрыклад, для актуалізацыі ведаў па тэме “Францыск Скарына. Развіццё беларускага кнігадрукавання” ў 10 класе можна прапанаваць вучням паняцці, якія звязаны з жыццём і дзейнасцю Францыска Скарыны .



Пры вывучэнні верша Я.Купалы “Спадчына” вучні могуць паспрабаваць скласці верш з прапанаваных слоў. Вучнёўскія варыянты бываюць даволі цікавыя. Можна пагутарыць з васьмікласнікамі  наконт слоў, якія выдзелены большым шрыфтам і правеслі лексічную работу.




Пры вывучэнні жыцця і творчасці У.Караткевіча прапаноўваю сабраць верш з ключавых слоў, скіроўваючы ўвагу вучняў на дзеясловы быў, ёсць, буду.




У 11 класе пры вывучэнні рамана І.Шамякіна ”Сэрца на далоні” пры першасным знаёмстве з раманам прапанавала вучням узнавіць тэкст і абараніць яго. Па выніках вучнёўскай работы можна зрабіць вывады аб адносінах вучняў да герояў,  глыбіні разумення зместу твора.



Такі від работы можна выкарыстоўваць і пры вывучэнні рамана “Людзі на балоце” І.Мележа. Вучням неабходна выбраць героя і ключавыя словы, якія да яго адносяцца. Можна прапанаваць зрабіць параўнальную характарыстыку, разгорнуты адказ або ўзнавіць тэкст, выкарыстоўваючы прыведзеныя словы.

Такім чынам, воблака слоў дапамагае ўдасканальваць аналітычныя ўменні вучняў, узнавіць моўныя і літаратурныя паняцці, творы, пазнаёмяць з прыёмамі работы з інфармацыяй: здабываць, аналізаваць, сістэматызаваць, рабіць высновы. У якасці дамашняга задання вучні могуць самі ствараць воблакі слоў па зададзеных настаўнікам крытэрыях.

Інтэрактыўны плакат - буйная дыдактычная адзінка, дыдактычны шматмерны інструмент настаўніка, дзе ёсць магчымасць шматузроўневай працы з вызначаным аб'ёмам інфармацыі на ўсіх этапах: першаснай перадачы, перапрацоўкі, сціску, кантролю.

Інтэрактыўны плакат дазваляе дасягнуць двух вельмі важных вынікаў: за кошт выкарыстання інтэрактыўных элементаў уцягнуць навучэнца ў працэс атрымання ведаў, дамагчыся максімальнай нагляднасці інфармацыі.




Інтэрактыўны плакат можа мець такі выгляд — шмат фотаздымкаў ці ілюстрацый, якія неабходна патлумачыць у кантэксце тэмы. Пры вывучэнні тэмы “Звесткі пра жыццё і творчасць У.Караткевіча” (11клас) прапаноўваю вучням ў групах ці індывідуальна, карыстаючыся плакатам, сістэматызаваць і абагульніць матэрыял, дадаўшы патрэбную інфармацыю.






*Скэтчноўтынг, ці візуальныя нататкі — гэта сродак, які робіць складанае простым* . Гэта асабая тэхніка канспектавання, дзе дзеці робяць нататкі з персанажамі, цытатамі, стрэлкамі і іншымі элементамі.




Усё гэта дапамагае структурыраваць, запамінаць і асэнсоўваць інфармацыю. Візуальныя выявы выкарыстоўваюцца нараўне з тэкстам, узмацняючы і паглыбляючы сэнс. Яны не толькі выконваюць функцыю ілюстрацыі, але і надаюць тэксту нагляднасць. Акрамя таго, скетчноўтынг вучыць асэнсоўваць, пераўтварыць і запамінаць інфармацыю.



Структура скэтчнататкі можа быць лінейнай, вертыкальнай, модульнай і інш. У адрознені ад скрайбінгу, які прымяняецца ў прафесійным асяроддзі (а гэтыя прыёмы вельмі падобныя) скэтчноўтынг выкарстоўваюць у асноўным для нататак і малююць (канспектуюць) у сшытку.

Маё імкненне напоўніць урок цікавым кантэкстам не абмежавалася толькі выбарам дыдактычнага матэрыялу і прымяненнем прыёмаў візуалізацыі.




Валоданне інфармацыйна-камунікатыўнымі тэхналогіямі дазволіла мне, улічваючы зацікаўленасць вучняў камп’ютарам, распрацаваць трэнажор не толькі для візуалізацыі , але і для ўдасканалення моўнай кампетэнцыі на аснове работы з тэкстам “Падарожжа па родным краі”. Трэнажор складаецца з наступных раздзелаў: “Тэарэтычны матэрыял”, “Тэксты”, “Матэрыял для карэкцыі”.

Вучні на любым з этапаў урока маюць магчымасць не толькі выбраць для адпрацоўкі адзін з тэкстаў, а і выбраць уласны тэмп работы, што з’яўляецца немалаважным фактам. Акрамя таго, што адбываецца ўдасканальванне моўнай кампетэнцыі, яшчэ і ўдасканальваецца лінгвакультуралагічная кампетэнцыя, бо ў трэнажоры падабраны тэксты з нацыянальна-культурным кампанентам.




Калі заданне на трэнажоры выканана правільна, то з’яўляюцца выявы, адпаведныя назве тэксту. У прыведзеным прыкладзе — гэта Слуцк.



Калі вучань пры выкананні задання на аснове тэксту робіць памылкі, то яму прапануецца паўтарыць тэарэтычны матэрыял, азнаёміцца з прэзентацыяй па пэўнай тэме. Можна зрабіць высновы, што з дапамогай візуалізацыі настаўнік мае магчымасць прадставіць, структураваць матэрыял, забяспечыць лагічнасць выкладу матэрыялу; правесці ўзаемасувязі паміж графічнай выявай і тэкстам, дае магчымасць павялічыць аб'ём інфармацыі, што істотна эканоміць час на ўроку, а самае галоўнае — забяспечвае якаснае ўспрыманне і засваенне вучэбнага матэрыялу на ўроках беларускай мовы і літаратуры**.**

## Персанальны сайт настаўніка беларускай мовы і літаратуры як сродак павышэння моўнай адукацыі

*Міґаль Алена Генадзеўна,*
*настаўнік беларускай мовы і літаратуры*
*ДУА "Хальчанская базавая школа"*

Ні для каго не з'яўляецца сакрэтам, што сайт установы адукацыі з'яўляецца не толькі важнай часткай адзінай інфармацыйнай прасторы ўстановы адукацыі, але і яго "тварам", люстэркам, у якім адлюстроўваюцца многія працэсы, што адбываюцца ва ўстанове. Такім жа люстэркам сучаснага педагога з'яўляецца і яго персанальны сайт.



Стварэнне і выкарыстанне персанальнага сайта пашырае інфармацыйную прастору, садзейнічае распаўсюджанню педагагічнага вопыту, забяспечвае зваротную сувязь настаўніка і вучняў, дапамагае наладзіць работу з вучнямі ў пазакласны час, удасканаліць работу з высокаматываванымі вучнямі.

Лепшыя з персанальных сайтаў настаўнікаў-прадметнікаў рэкамендаваны Нацыянальным інстытутам адукацыі. Для таго каб пазнаёміцца з прыкладамі лепшых распрацовак, трэба на сайце інстытута знайсці спасылку “Электроннае навучанне – вучымся анлайн”. Далей на старонцы e-vedy выбраць “Дыстанцыйны ўсенавуч” і на наступнай старонцы знайсці спасылку на чырвоным фоне “З вопыту работы” – “з вопыту работы педагогаў Рэспублікі Беларусь”. У раздзеле размешчаны спасылкі на лепшыя персанальныя сайты настаўнікаў-прадметнікаў Беларусі. У самым нізе старонцы пададзены спасылкі на сайты настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры.




Персанальны сайт любога настаўніка-прадметніка складаецца з пэўных раздзелаў і старонак. Напрыклад, сайт “Падабайкі роднай мове” Зэльвенскага раённага вучэбна-метадычнага кабінета, дыпламант XII рэспубліканскага конкурсу “Камп’ютар. Адукацыя. Інтэрнэт”, дазваляе падрыхтавацца да вучэбных заняткаў па беларускай мове і літаратуры, пазнаёміцца з багатай беларускай лексікай (у раздзеле “Хмарачосы лексікі”).




Рэсурс праводзіць анлайн-алімпіяды і творчыя конкурсы, удзел у якіх садзейнічае пашырэнню кругагляду вучняў. Гэты сайт можна выкарыстаць пры падрыхтоўцы да прадметных алімпіяд і творчых конкусаў.




Рэсурс “Візаві” распрацаваны настаўнікам-метадыстам Сілюк Н.У. (ДУА “Юрацішкаўскі яслі-сад – сярэдняя школа”) і метадыстам АПА Акушэвічам А.А. Сайт змяшчае аўтарскія відэаролікі і інтэрактыўныя заданні па раздзеле “Сінтаксіс і пунктуацыя”, і адрасаваны вучням. Дзецям прапануецца праглядзець відэаролік і выканаць тэст для самаправеркі. Для забеспячэння зваротнай сувязі на сайце прадугледжана асобная старонка.




Сайты настаўніка-метадыста ДУА “Лельчыцкая раённая гімназія” Казачэнка Ірыны Рыгораўны прапануюць вучням прайсці вэб-квэсты. Напрыклад, “Эпоха Барока”, “Дарогамі першадрукароў”, “Беларускаму дудару” і інш. Дадзены від работы з вучнямі дазваляе не толькі ўключыць дзяцей у актыўную дзейнасць, карыстаючыся сродкамі ІКТ, але і паглыбіць іх веды па навучальных прадметаў, пашырыць кругагляд вучняў.



На сайце “Present day мова” можна знайсці прыклады выкарыстання метадаў і прыёмаў візуалізацыі: інтэрактыўныя плакаты, прэзентацыі, кластары і інш. Сайт змяшчае метадычныя напрацоўкі, дадатковую літаратуру для настаўнікаў, карысныя парады па падрыхтоўцы да напісання творчых работ і г.д. Асобны раздзел адведзены працы настаўніка па падрыхтоўцы да цэнтралізаванага тэсціравання.




Сайт – гэта магчымасць сабраць у адным месцы ўсе напрацоўкі настаўніка-прадметніка і спасылкі на карысныя рэсурсы. Напрыклад, на сайце настаўніка-метадыста ДУА “Хальчанская базавая школа” Мігаль Алены Генадзьеўны  змешчаны больш за шэсцьсот анлайн-практыкаванняў па беларускай мове і літаратуры, краязнаўстве і гісторыі.




Літаратура – гэта толькі адзін з відаў мастацтва. Выкладанне літаратуры ў сувязі ў тэатрам і кіно дапамогуць аналіз экранізаваных твораў беларускай класікі. На вучэбных занятках настаўнік можа прапанаваць вучням паглядзець відэафрагмент, адабраць пэўны моўны матэрыял (напрыклад, ужытыя ў фрагменце дыялектныя словы), параўнаць розныя экранізацыі аднаго і таго ж твора, стварыць афішу або схему-апісанне галоўных дзеючых асоб.

Вялікую ролю адыгрывае развіццё маўленчай культуры вучняў. На сайце “Ведай” сабрана значная колькасць аўдыязапісаў, якія можна  выкарыстаць як на вучэбных і факультатыўных заняткаў, так і ў пазаўрочны час.




Артыстычнае чытанне стане ўзорным для вучням. Таксама на аснове запісаў ствараць свае або рабіць інсцэніроўкі фрагментаў твораў.




Карыснымі для вучняў і іх бацькоў будуць і слоўнікі і даведнікі. На сайце змешчаны розныя вучэбныя дапаможнікі, якімі могуць карыстацца вучні пры падрыхтоўцы да вучэбных заняткаў і да прадметных алімпіяд.




Такім чынам, сайт педагога – гэта ўніверсальны сродак, які можа значна паспрыяць не толькі распаўсюджанню ўласнага педагагічнага вопыту, але і пашырэнню моўнай адукацыі вучняў.

**Карткі-канструктар урока для ўдасканалення метадычнай кампетэнтнасці настаўнікаў**

*Казачэнка Ірына Рыгораўна,*
*настаўнік беларускай мовы і літаратуры*
*ДУА “Лельчыцкая раённая гімназія”*




Даволі доўга ў адукацыі выкарыстоўваліся тэрміны план і план-канспект урока, аднак у сучаснай метадычнай літаратуры часцей ідзе гаворка не пра планаванне ўрока, а пра яго праектаванне. Хачу прапанаваць сваё бачанне праектавання ўрока пры дапамозе картак-канструктара ўрока.




Для таго, каб развіваць у вучняў кампетэнцыі XXI стагоддзя, імі павінен валодаць настаўнік. Таму пры планаванні работы метадычных аб’яднанняў педагогаў раёна ўключаем у практыку сучасныя інтэрактыўныя формы, актыўныя методыкі навучання: метадычны практыкум, рашэнне педагагічных задач, метадычны дыялог, вебінар і інш.

З мэтай развіцця ў педагогаў сучасных метапрадметных і надпрадметных кампетэнцый быў створаны камплект метадычных картак «Канструктар эфектыўнага ўрока». З дапамогай прапанаванага набора форм работы на ўроку, прыёмаў і дзеянняў кожны настаўнік можа спланаваць заняткі па любой тэме і

для любой аўдыторыя вучняў. Ідэя канструктара ўрока ў тым, каб падбіраць разнастайныя методыкі, ствараць з іх камбінацыі і паслядоўнасці, з якіх атрымаюцца эфектыўныя ўрокі. Канструктар дапамагае праектаваць цікавыя заняткі, зацікавіць вучняў цікавым працэсам, дапамагае навучэнцам набываць вопыт, а не атрымліваць гатовы матэрыял, павышаць метадычную кампетэнцыю педагогаў, развіваць ключавыя кампетэнцыі XXI стагоддзя.




У набор канстуктара ўваходзіць 50 картак для праектавання заняткаў. Колькасць метадычных картак паступова павялічваецца, дапаўняецца новымі цікавымі прыёмамі работы на ўроку. ***Метадычныя карткі*** "Індывідуальная работа", "Франтальная работа", "Работа ў пары", "Малая група з настаўнікам", "Групавая работа", "Работа з лічбавым кантэнтам" дазваляюць выбраць віды ўзаемадзеяння на любым уроку. Гэтыя карткі двухбаковыя: на адным баку абазначаны від работы на ўроку, на другім прадстаўлены спосаб прымянення гэтага віду работы на занятках.




***Карткі тайм-менеджмента*** "Месца", "Тэмп", "Час", "Анлайн", "У класе" даюць магчымасць прагназаваць, якім чынам вучань будзе пракладваць сваю траекторыю дзейнасці на занятках. Такія карткі аднабаковыя, яны маюць аднолькавы колеравы фон.




***Карткі кантролю і ацэнкі*** “Дыягнастычнае тэсціраванне”, “Функцыянальнае ацэньванне”, “Выніковае ацэньванне” дапамогуць настаўніку спланаваць кантрольна-ацэначную дзейнасць. Колеравы фон гэтай групы картак – адценні жоўтага. Гэтыя карткі таксама двухбаковыя: на адным баку абазначаны від кантролю на ўроку, на другім – спосаб прымянення.




Карткі “Прыём” і “Рэфлексія” дапамагаюць зрабіць урок цікавым. У наборы 12 картак з відамі рэфлексіі, 14 картак з ***прыёмамі*** работы. Карткі “Рэфлексія” ружовага фону, на адваротным баку прапанаваны віды рэфлексіі.



Карткі “Прыём” маюць зялёны фон. Яны двухбаковыя. На адным баку сімвал, які абазначае прыём, на другім – апісанне гэтага прыёма.




6 картак “Матывацыя” маюць чырвоны фон; на адваротным баку картак прапанаваны некалькі прыёмаў матывацыі вучэбнай дзейнасці, якія настаўнік можа выкарыстоўваць на пачатку ці напрыканцы ўрока. У пачатку нашай сустрэчы я прапанавала вам адзін са спосабаў матывацыі: відэасюжэт. Ён доўжыўся ўсяго 15 секунд. Такія відэа я час ад часу рыхтую і для вучняў.




6 картак “Фізкультхвілінка” маюць ярка-зялёны колер; на адваротным баку размешчаны прыклады фізкультхвілінак і дынамічных паўз.

На пасяджэннях МА настаўнікаў рускай мовы і літаратуры, беларускай мовы і літаратуры, спланаваных як метадычная майстэрня, праводзілася вучоба педагогаў па рабоце з такімі карткамі. Настаўнікі падзяліліся на 6 мікрагруп. Кожная група атрымала набор картак і аркуш паперы з тэкстам, на якім былі прапанаваны тыпы ўрокаў: урок тлумачэння новага матэрыялу, замацаванне вывучанага матэрыялу, абагульненне і сістэматызацыя ведаў. 2 групы планавалі адзін тып урока. Гэта рабілася для таго, каб паказаць, што адзін і той жа тып урока можа быць пабудаваны па-рознаму з адным наборам картак.




Напрыклад, пры вывучэнні тэмы “Аднасастаўныя сказы” ў пачатку ўрока пры мэтавызначэнні можна выкарыстаць прыём “Закончы фразу”: ведаю …, хачу даведацца …, умею … . Далей можна прапанаваць вучням дыягнастычны тэст “Галоўныя і даданыя члены сказа” (картка кантролю і ацэнкі “Дыягнастычнае тэсціраванне”). Заданне вучні выконваюць у класе за пэўны прамежак часу (картка тайм-менеджмента “У класе”, “Час”). Для выканання такога задання можна прапанаваць тэст у Гугл-форме. Настаўнік атрымлівае зваротную сувязь, апрацоўвае інфармацыю (нават, калі гэта будзе пасля ўрока).




На наступным этапе ўрока настаўнік дзеліць дзяцей на 3 групы і прапаноўвае правесці лінгвістычнае даследаванне (картка “Матывацыя”). 1-я група працуе з падрыхтаваным відэафрагментам (метадычная картка “Работа з лічбавым кантэнтам”), запаўняе падрыхтаваную настаўнікам табліцу (прапанаваны сказы; трэба знайсці выказнік; – вызначыць яго часцінамоўную прыналежнасць; – у выказніках, выражаных дзеясловам, абазначыць непастаянныя марфалагічныя прыметы (час, лік, асобу ці род); – зрабіць вывад пра розныя спосабы выражэння дзеяння ў аднасастаўных сказах). Па меры запаўнення табліцы настаўнік ацэньвае ўзровень разумення матэрыялу вучнямі (картка кантролю і ацэнкі “Фарміруючае ацэньванне”).

2-я група працуе з карткай з практыкаваннем (з матэрыялам вучэбнага дапаможніка): вучні чытаюць сказы, знаходзяць граматычную аснову, вызначаюць сказы з адным і з двума галоўнымі членамі. Такі від работы можна

прапанаваць вучням у выглядзе інтэрактыўнага практыкавання, напрыклад, на рэсурсе learningapps (картка тайм-менеджмента «Анлайн»). Для мадэлявання ўрока таксама прапаноўваецца картка «Фарміруючае ацэньванне».

Трэцяй групе настаўнік сам тлумачыць вучэбны матэрыял (метадычная картка «Малая група з настаўнікам»). Узровень разумення матэрыялу ацэньвае ў ходзе гутаркі (картка кантролю і ацэнкі «Фарміруючае ацэньванне»).




На наступным этапе першая група атрымлівае канверт з заданнем размеркаваць прапанаваныя прыклады па відах аднасастаўных сказаў (метадычная картка «Групавая работа»). Настаўнік прапануе адзначыць розныя віды сказаў каляровымі маркерамі (картка тайм-менеджмента «У класе»). Вучні атрымліваюць кансультацыю настаўніка (метадычная картка «Малая група з настаўнікам») па пытаннях, якія засталіся незразумелымі па ходу заняткаў.

Другая група працуе з настаўнікам: запаўняе шаблон табліцы (суадносяць прыклад сказа – від аднасастаўнага сказа). Настаўнік вызначае узровень разумення вучнямі матэрыялу ўрока; прапаноўвае паглядзець відэапрэзентацыю (метадычная картка «Работа з лічбавым кантэнтам»).

Трэцяя група знаёміцца з відэапрэзентацыяй (метадычная картка «Работа з лічбавым кантэнтам»), адказвае на пытанні настаўніка (картка кантролю і ацэнкі «Фарміруючае ацэньванне»). Далей можна прапанаваць работу з карткай размеркаваць прапанаваныя прыклады па відах аднасастаўных сказаў (метадычная картка «Групавая работа»).

На гэтым жа этапе праводзім фізкультхвілінку.



Напрыканцы ўрока настаўнік праводзіць выніковае ацэньванне (картка кантроля і ацэнкі). На дадзеным этапе можа быць выкарыстаны прыём «Так / не», анлайн-тэст, створаны ў Гугл-форме, раздрукаваны тэст.

Усе методыкі канструктара апасродкавана развіваюць кампетэнцыі вучняў: крэатыўнае мысленне, крытычнае мысленне, кааперацыя, камунікацыя. Праектаванне ўрокаў з канструктарам – гэта творчасць педагогаў.

Карткі дапамагаюць спрагназаваць улік часу пры планаванні ўрока. Настаўніку, візуальна пабудаваўшы метадычную структуру ўрока, лягчэй размеркаваць час на розныя віды вучэбнай дзейнасці. Гэтаму дапамагаюць карткі тайм-менеджмента.

Акрамя таго, дадзены канструктар урока з’яўляецца сродкам візуалізацыі, так як дае магчымасць педагогу мадэляваць вучэбны матэрыял урока, што спрыяе больш глыбокаму асэнсаванню метадычнага матэрыяла заняткаў.




Такі спосаб праектавання дзейнасці сумеснай дзейнасці настаўніка і вучняў на ўроку кампактны і зручны для выкарыстання. Прымяненне настаўнікам набора картак для планавання ўрока дапамагае ставіць перад сабой канкрэтную задачу і знаходзіць шляхі яе вырашэння; наглядна праектаваць працэс вучэбных заняткаў (выкарыстанне тэхналогіі візуалізацыі ў працэсе ўдасканалення метадычнай кампетэнцыі настаўніка); аптымальнаму выбару форм, метадаў і сродкаў арганізацыі ўрока.